Тэлесеткі



## СУЗОР'Е НА «МІНСК-АРЭНЕ»

У гэтыя выхадныя зоркі будуць зззяць асабліва ярка і не толькі на небе, у адпаведнасці з дэвізам дзіцячага «Еўрабачання-2018» — Light Up! Запальвай! У рэкордным спісе ўдзельнікаў з 20 краін — 2 дэбютанты, Казахстан і Уэльс, і некалькі вяртанняў: Францыя, якая не ўдзельнічала ў шоу з 2005 года, Азербайджан (прапускаў тры гады) і Ізраіль (прапускаў 2013—2015 і 2017 гады).

Юныя артысты ўжо правялі індывідуальныя рэпетыцыі, запісалі агульную песню — афіцыйны гімн конкурсу, наведалі знакавыя мясціны беларускай сталіцы і, канешне, пазнаёміліся і пасябравалі ў «Еўрадоме». Цяпер справа за малым: на генеральным прагоне і фінальным канцэрце 24 і 25 лістапада выйсці і паказаць сябе з найлепшага боку.

Звярніце ўвагу: у адрозненне ад дарослага шоу, дзіцячае пачынаецца ў «дзіцячы» час, а 18-й гадзіне, і будзе доўжыцца ўсяго 2,5 гадзіны. Каментаваць фінальны канцэрт на «Мінск-Арэне» ў прамым эфіры будуць тэлевядучыя Георгій Калдун і Андрэй Макаёнак. Радыётрансляцыю цырымоніі з каментарыямі Вікторыі Урбановіч і Паўла Лазовіка правядзе Першы канал Беларускага радыё, анлайн трансляцыя — на сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by ці на афіцыйным сайце конкурсу junioreurovision.tv.

Акрамя таго, з сённяшняга дня можна прымаць удзел у глядацкім галасаванні на сайце junioreurovision.tv. Можна выбраць ад трох да пяці ўпадабаных выканаўцаў — прычым гэта можа быць і прадстаўнік Беларусі! Першы этап галасавання закрыецца 25 лістапада перад пачаткам шоу, а стартуе наноў пасля фінальнага канцэрта і толькі на 15 хвілін. Вынікі галасавання гледачоў будуць прыплюсаваныя да балаў нацыянальнага журы кожнай краіны — удзельніцы шоу, і пераможца дзіцячага «Еўрабачання-2018» вызначыцца па суме балаў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**




## ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 76

**З 27 кастрычніка да 4 лістапада ў Гомелі адбыўся маладзёжны чэмпіянат свету па шашках-100. Спаборніцтвы праводзіліся асобна сярод юнакоў і дзяўчат у чатырох узроставых групах па дзвюх праграмах — класічная гульня і бліц.**

У класічнай праграме чэмпіёнамі свету сталі Міхаіл Семянюк, Вікторыя Нікалаева і Любоў Кобрына.

Бронзавыя ўзнагароды ў Яны Лазовік і Анастасіі Сакаловай.

У вокамгненнай праграме Паліна Петрусёва і Вікторыя Нікалаева — чэмпіёнкі свету. Георгій Выдзерка і Дар'я Нікіфарава — бронзавыя прызёры.

**№ 78**



**№ 78** І. Дзячэнка — І. Логінаў

**Белыя простыя шашкі:** а5, b4, c1, c3, d2, e3, f2, h4, h6 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** а3, а7, c5, c7, d6, e5, e7, f8, g7 (9).

Белыя выкарыстоўвалі «рэшата» ў размяшчэнні праціўніка і правялі разгромную камбінацыю. Паспрабуйце адшукаць яе самастойна.

У выпуску № 74 ад 26.10.2018 была апублікавана кампазіцыя № 73.

**Белыя простыя шашкі:** d2, f4, g1, g5, h2 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, b6, d4 (3).

Нашы чытачы П. і В. Шульгі прапануюць ускладніць пазіцыю наступным чынам:

**№ 79**

**Белыя простыя шашкі:** а5, c3, d2, e3, g1, g5, h2 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** а3, b6, c5, c7, d8, f2 (6).

1. b4, 2. b8 (b2), 3. e5, 4. c3, 5. g3, 6. a7 x

Аднак у цікавым механізме маецца ЧПР 3. ba7 +

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя ўкраінскім шашачным кампазітарам І. Івацка.

**№ 80**

**Белыя простыя шашкі:** 16, 19, 20, 21, 24, 30, 36, 41, 43, 47, 48, 49 (12).

**Чорныя простыя шашкі:** 9, 12, 15, 18, 27, 28,32, 33, 37, 38, 40 (11).

**№ 81**

**Белыя простыя шашкі:** 13, 18, 19, 20, 21, 24, 31, 41, 45 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** 10, 16, 29, 32, 33, 34, 35, 40 (8).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 75 ад 09.11.2018.

**№ 75** cd6, hg7, ef8, f6, h4, a1+.

**№ 76** 22.33.2.5+.

**№ 77** 12.2.36.23.22.50+.

Дакладныя адказы даслалі В. Дударэвіч *(в. Новая Мыш, Баранавіцкага раёна)*, Ф. Карпей *(Мядзел)*, У. Статкевіч *(п. Зялены Бор Івацэвіцкага раёна)*, У. Панько *(Камянец)*, І. Ананіч *(Гродна)*, А. Шурпін *(Івянец)*, В. Ваўчкоў *(Маладзечна)*, П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў *(усе — Мінск)*, В. Таўкачоў *(Клімавіцкі раён)*, В. Бандарык *(Мінскі раён)*.

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





Сядзі і глядзі

## ЗАБЛЫТАНЫ КЛУБОК ПАЧУЦЦЯЎ



**«Саша + Даша + Глаша»**
**«Беларусь 1», 26 лістапада**

Даша і Глаша — дзве сястры, у якіх не надта добрыя стасункі. Аднойчы модны часопіс, у якім працуе Даша, змяняе тэматыку, і падчас рэдакцыйнага задання дзяўчына знаёміцца з шэф-поварам Сашам, пад уплывам пачуццяў да якога хутка атрымлівае павышэнне, а разам з тым і наладжвае адносіны з сястрой. Але тут высвятляецца, што Глаша таксама ведае кавалера сястры — ды не проста ведае, а закаханая ў яго яшчэ са школьных часоў, і зразумела, што ладам гэтыя калізіі не скончацца...

**«Востраў непатрэбных людзей»**
**СТБ, з 26 лістапада**



Андрэй Каморын — уладальнік паспяховай будаўнічай фірмы. Павел — сын-аўтыст вядомага артыста, Александрына — экстрасэнс, сям'я Жукавых — фермеры, Савелій — дэпутат, Вадзім і Каця — не самая шчаслівая сям'я з дзяўчыныпадлеткай і бацькі, а Коклюш — наогул кілер. І ўсе яны разам праз турфірму-аднадзёнку трапілі на ненаселены востраў, бо блізкія людзі палічылі іх лішнімі ў сваім жыцці. Каб выжыць і атрымаць другі шанц, ім давядзецца мяняць свае звычкі, а часам нават ламаць сябе.



**«Вечнае зззянне чыстага розуму»**
**TV1000, 29 лістапада — 2 снежня**

Вучоныя сканструявалі апарат, які дазваляе людзям сцерці з памяці непатрэбныя ўспаміны, — і вось жыццярадасная Клемянціна выдаляе са свайго жыцця меланхоліка Джоэла, каб лягчэй перанесці разрыў з ім. Джоэл у адказ спрабуе зрабіць тое самае, аднак штосьці ідзе не па плане, і чалавечая падсвядомасць адмаўляецца «аддаваць» бяздушнай тэхніцы дарагія сэрцу моманты... Дзе яшчэ вы ўбачыце кранальнага і зусім некамедыйнага Джыма Керы?

**«Бум» і «Бум-2»**
**«МІР», 30 лістапада**



Юная француженка Вік пераходзіць у новую школу, заводзіць новых сяброў і перажывае ўсе стадыі першага падлеткавага кахання: танцы, спатканні, пацалункі, сваркі і прымірэнні... У 90-я гады прыгоды Вік, яе сяброўкі Пенелопы, прабабулі Пулет і ўсіх астатніх разнявалена-рамантычных французаў вокамгненна сталі кінахітом, а заганаўлая музычная тэма разышлася па свеце ў колькасці 8 мільёнаў копій. Сёння, канешне, падзеі фільма выглядаюць наіўнай меладрамай — асабліва калі ўспомніць, што Сафі Марсо ўжо 52 гады.



**«Двое ў новым доме»**
**«Беларусь 3», 2 снежня**

Сяргей — студэнт-завочнік, рабочы радыёзавода, і Нэля — гід «Інтурыста», жанатыя аднесна нядаўна, але ўжо перажываюць сямейны крызіс. Жыццё з маленькай дачкой на прыватнай кватэры, сумяшчэнне вучобы з працай, неабходнасць эканоміць — усё гэта выклікае ў Нэлі раздражненне, а муж падаецца хоць і добрым, але занадта мяккім і слабым, зусім няздольным пастаяць за сябе. У адрозненне ад Волкава — начальніка аддзела, паспяховага і прадпрымальнага, з якім у Нэлі пакрысе завязваецца раман...




## Паспрабуй расчуліць здань

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**пухі́р** — балючае ўздуцце скуры ад апёку;

**здань** — прывід;

**псава́ць (дзеясл.)** — наносіць шкоду чаму-небудзь;

**расчу́ліць (дзеясл.)** — выклікаць пачуццё жалю;

**ко́рак** — затычка для бутэлек;

**шва́гер** — брат жонкі або муж сястры;

**не па днях, а па гадзінах** — вельмі хутка расці, развівацца (беларускі адпаведнік: *як грыбы (пасля дажджу)*; рускі: *как на дрожжах)*;

**псаваць кроў** — рабіць непрыемнасці каму-небудзь або сабе, моцна раздражняць (беларусы яшчэ скажуць: *выводзіць з сябе, дражніць гусей*; руская: *играть на нервах)*.

*Для тых, хто разважае пра свой удзел у тэлевіктарыне, нагадаем: каб стаць удзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Паўторы выпускаў тэлевіктарыны — у ранішнім эфіры «Беларусь-3» кожную суботу.*

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**